# ПІСЬМОВЫ АДКАЗ ГРАМАДЗЯНІНУ

Пракурору г. Мінска

Добры дзень, шаноўныя юрысты!

Хачу выказаць Вам падзяку за дапамогу і падтрымку ў якасным тлумачэнні юрыдычных тэрмінаў і пытанняў. Хацелася б высветліць яшчэ не менш важныя для мяне пытанні і атрымаць вычарпальны і ясны адказ.

За здзяйсненне злачынства, прадугледжанага ч. 1 арт. 317-1 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, мне было прызначана пакаранне ў выглядзе аднаго года пазбаўлення волі з пазбаўленнем права кіравання транспартным сродкам тэрмінам на пяць гадоў. Праў кіравання, якія выдаюцца ва ўсталяваным парадку, я не меў (не меў ніколі! Аўташколу не заканчваў, у ДАІ экзамен не здаваў!). Ці могуць па заканадаўстве пазбавіць прыгаворам суда чалавека таго, чаго ён не мае і ніколі не меў, г. зн. праў кіравання транспартным сродкам?

Другое пытанне тычыцца майго знаходжання ў месцах пазбаўлення волі. У маі 1990 года я злучыў сваё жыццё з Чарновай Ірынай Алегаўнай, у якой на той момант была дачка Дар'я Іосіфаўна, 1983 г. нараджэння. Мы афармілі шлюбныя адносіны, і Ірына Алегаўна ўзяла маё прозвішча. Дачку жонкі я не ўдачарыў, бо ў яе ёсць біялагічны бацька, які з'ехаў на сталае месца жыхарства ў Ізраіль. У 1991 годзе ў нас з Ірынай Алегаўнай нарадзілася агульнае дзіцё, сын Станіслаў. У 2007 годзе Дар'я Іосіфаўна выйшла замуж і змяніла прозвішча на Краўцову.

Як я напісаў вышэй, у дадзены момант я адбываю пакаранне. Мая сям'я, у тым ліку і дачка жонкі, мая падчарка, імкнецца максімальна падтрымліваць са мной роднасныя адносіны.

У наш час заканадаўства часта змяняецца і карэктуецца. Дапамажыце, калі ласка, і падкажыце, ці можа мая дачка (падчарка) адносіцца да ліку блізкіх сваякоў і прыязджаць да мяне на працяглае спатканне з астатнімі членамі маёй сям'і? Калі так, то што мне трэба для гэтага зрабіць?

З павагай і загадзя ўдзячны,
Аляксандр Яўгенавіч Зайцаў.